

На здымку: Л. Ф. Яўменаў.

Нашы славутыя землякі

# ВУЧОНЫ І ПАЭТ

У ВАГУ кожнага з нас у гэтыя дні прыцягваюць матэрыялы перыядычнага друку, прысвечаныя падрыхтоўцы да XXVII з'езда КПСС. Праглядаючы старонкі старэйшага беларускага часопіса «Полымя», у чэрвеньскім нумары за гэты год у раздзеле «Публіцыстыка» мой позірк імгненна скіраваўся на радкі: «...Калі б толькі ні паўстаў у маім унутраным свеце вобраз Леніна, мне ўспамінаецца родны Хоцімск, ягоная плошча, узятая зялёнай травіцай, акружаная плотам з прывязанымі да яго коньмі сялян, з прысадамі дрэў, кустамі язміну ды бэзу, з вялікай буданінай, што доўгія гады служыць домам культуры, і на гэтай плошчы помнік Леніну. Помнік акружаны буйным зеленівам і рознакаляроўем местачковага кветніка...».

Як хораша выказана думка аўтарам! Далей магнітам прыцягвае тэкст нарыса «Ленін. Сучаснасць. Будучыня». Міжволі скіроўваю ўвагу на аўтара нарыса. Лявон Яўменаў! Ды гэта ж вядомы савецкі філосаф. наш зямляк Леанід Фёдаравіч Яўменаў! Нарадзіўся ён 22 ліпеня 1932 года ў сям'і настаўнікаў на Хоцімшчыне. У 1955 годзе скончыў аддзяленне філасофіі гістарычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна, у 1961 — Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС. Працаваў сакратаром Мінскага гаркома ЛКСМБ, у апараце ЦК КПСС, інстытуце замежных моў, БДУ імя У. І. Леніна, на ЭКСПА-67 у Манрэалі, быў рэферэнтам аддзела навукі і культуры савецкага павільёна, з 1971 па 1974 годы — супрацоўнік дэпартамента сацыяльна-гуманітарных навук і культуры сакратарыята ЮНЕСКА ў Па-

рыжы. З 1979 года — загадчык сектара інстытута філасофіі і права Акадэміі навук БССР. Доктар філасофскіх навук, прафесар.

Навуковыя працы Леаніда Фёдаравіча «Крытыка скажэнняў дыялектыкі сацыялізму ў сучаснай буржуазнай філасофіі» (1961), «Дыялектыка і рэвалюцыя» (1969), «Ленінізм і сучасная ідэалагічная барацьба» (1970), «Філасофія антымарксізму і дыялектыка» (1981) і другія вызначаюцца навуковай аргументаванасцю, прынцыповасцю і гарачым пачуццём у абароне марксісцка-ленінскай філасофіі.

З павагаю знаёмлюся з «Філасофіяй антымарксізму і дыялектыкай». Кніга вельмі змястоўная і цікавая, адрасавана навуковым супрацоўнікам, выкладчыкам і студэнтам вышэйшых навучальных установ, слухачам вышэйшага звяна партыйнай асветы, прапагандыстам. Яна напісана добрай мовай, аўтар добры палеміст, вельмі дарэчы яго звароты да выказванняў з латыні, якія падкрэсліваюць пераемнасць карэнных філасофскіх ідэй чалавецтва.

Леанід Фёдаравіч праз усё сваё жыццё пранёс любоў да паэзіі, якую палюбіў яшчэ ў дзяцінстве. Першыя вершы былі надрукаваны ў 1949 годзе. З 1956 года паэтычныя падборкі перыядычна друкуюцца ў «Чырвонай змене», «Настаўніцкай газеце», «Звяздзе», «Літаратуры і мастацтве», часопісах «Полымя», «Маладосць». Яны звярнулі ўвагу літаратурнай грамадскасці свежасцю паэтычнай думкі, схільнасцю да філасофскага абагульнення.

У 1980 годзе дэбютаваў у паэзіі сваім першым зборнікам «Чужая планета». З радасцю чытаюцца простыя, шчырыя словы верша-гімна «Маці маёй зямлі», якім адкрываецца зборнік і прысвечаны Бацькаўшчыне, роднай зямлі Хоцімскай.



Імёны

Ад лесу, ад лёну —
Полі, Алесі, Алёны,
Сэрцы ад глебы і сонца,
Рукі ад працы бясконцай,
Каб вы жыццё
Не няньчылі
Каб не паілі мудрасцю,
Не сагравалі
Пяшчотаю —
Зачахлі б вёсны
Вірлівыя,
Спусцелі б нівы
Ўрадлівыя,
Замоўклі б песні
Вясельныя,
Асірацела б Зямля...

Адвечная і заўсёды новая тэма бацькоўскага краю выклікала да жыцця такія натуральныя і каларытныя паэтычныя вобразы. Значнае месца ў першай кнізе займаюць замежны цыкл «Канадскі сшытак» і «Французскі сшытак». Гэта вершы далёкіх дарог і вяртання да вытокаў маленства, роднае мовы і беларускай зямлі. У зборніку натуральна пераклікаюцца пачуцці павагі да іншых народаў і краін з пачуццямі глыбокай

любові да роднага краю, Савецкай Радзімы. Паэт рашуча выступае супраць буржуазнага ладу жыцця, які абражае і нішчыць годнасць чалавека.

З выхадам першага зборніка, краязнаўцы Трасцінскай сельскай бібліятэкі распачалі перапіску з земляком. У адказ атрымалі аўтограф на зборніку «Шаноўным землякам маім з павагаю глыбокаю як бездань. Л. Яўменаў, лістапад 1981» і адказы на цікавячыя пытанні. На пытанне «Калі ўзнікла душэўная патрэба ў паэтычным самавыяўленні?» адказ быў даволі падрабязны:

— Даўно і, лічу, традыцыйна. Гадаваўся я ў далёкім сяле і мэстэчку Хоцімск на Магілёўшчыне. Мая бабуля Еўдакія Прохараўна ведала шмат народных песень, прыпевак, казак, легенд і нават пародый на некаторыя тэксты Бібліі. Таму я з маленства адчуў вялікую сілу народнай паэтычнай творчасці. Маці, настаўніца, навучыла мяне разумець і любіць паэзію Багушэвіча, Багдановіча, Коласа, Купалы, Труса, творчасць вялікіх рускіх паэтаў. Да таго ж мае блізкія і знаёмыя захапляліся паэзіяй Аркадзя Куляшова. Менавіта пад уплывам яго паэзіі пачаліся мае першыя, яшчэ дзіцячыя пробы пяра. І, нарэшце, другая «малая радзіма», родны край жонкі, дзіўны прынёманскі край, сапраўдны помнік старажытнай і навейшай гісторыі, вёска Магільна і яе наваколле з маленькаю лясной вёскай па імю Куль, цудоўныя людзі, вясковыя цёткі і дзядзькі, іх неверагодна прыгожая беларуская мова — менавіта тут, пачынаючы з 1956 года і аж дагэтуль, адбываюцца мае не вельмі частыя, але пастаянныя сустрэчы на сцежцы паэзіі.

На пытанне, як Леанід Фёдаравіч сумяшчае філасофію і паэзію, адказ быў такі:

— Некаторыя лічаць філасофію і паэзію антыподамі. Гэта не так. Па-першае, гістарычна некалі і адно, і другое было адзіным і непадзельным здабыткам чалавечага духу. У адной асобе ўвасабляліся і філосаф, і паэт. Карацей кажучы, я імкнуўся, каб у філасофскіх працах білася жывое пачуццё, а ў паэтычных радках свяцілася філасофская думка. Імкнуся... Бо гэта вельмі тонкі і складаны працэс, які не заўсёды ўдаецца.

Вершы «Чацвёртага лютага», «Лясы мае!», «Родны кут» і другія напісаны паэтам у адказ на нашу просьбу напісаць творы аб Хоцімшчыне і нашым Прыбяседдзі. У свой час у адказе зямляк паведамляў: «...збіраюся самае малае напісаць вялікую нізку. Але для гэтага абавязкова трэба аднавіць у сэрцы гады дзяцінства, падняць самыя глыбінныя паэтычныя пласты душы. Гэта значыць, зноў пахадзіць сцяжынкамі роднага кутка». І сваё абяцанне ён выконвае. У сяле Хоцімск жыве яго родны дзядзька Пятро Лявонавіч, да якога ён прыязджаў на сустрэчу са сваёй Бацькаўшчынай. Наведаў і запаветны для яго куток — дом маці Аркадзя Куляшова Кацярыны Фамінічны, дзе добра пісалася і бралася натхненне ў народнага паэта БССР. Натхняюць і Леаніда Фёдаравіча родныя сцежкі Прыбяседдзя і родны матчын парог.

**М. ЛАСОЎСКІ,**
бібліятэкар-краязнаўца.

**Фота У. Крука.**

**Ласоўскі, М.** Вучоны і паэт : [пра Леаніда Фёдаравіча Яўменава, беларускага вучонага-філасофа, паэта, перакладчыка] / М. Ласоўскі // Шлях Кастрычніка.— 1985.—19 снежня.— С.2-3.